Журфак литературный

Тіньа

Март-апрель, 2007 № 3-4 (17-18)

«Любоў насамрэч» і «Крымінальнае чытво» *па-беларуску*

Перад паказам фільма "Крымінальнае чытво" ў "Падземцы" было як ніколі ўтульна. Журналістаў частавалі гамбургерамі і колай, не было толькі легендарнага кактэля за 5 даляраў…
Калі першы раз глядзела "Криминальное чтиво", адзін з самых вядомых фільмаў рэжысёра Квэнціна Таранціна з Джонам Траволтам і Умай Турман ў галоўных ролях, нават падумаць не магла, што бандыты і авантурысты пачнуць размаўляць… па-беларуску… Гэта стала магчымым дзякуючы намаганням удзельнікаў праекта "Беларускі Гальфстрым", які напачатку 90-х гадоў паўстаў як літаратурнае згуртаванне на базе Беларускага гуманітарнага ліцэю. У 2004 годзе адбылося аднаўленне суполкі як кінаклубу. Франак Вячорка прапанаваў заняцца дубляваннем вядомага кіно на беларускую мову. Хутка ўсе студэнты журфака змогуць паглядзець "Крымінальнае чытво" і ацаніць працу тых, хто агучваў ролі: Лявона і Ганны Вольскіх, Аляксандра Памідорава, Піта Паўлава, Аляксея Янукевіча, Юры Жыгамонта… А пакуль размова з кіраўніком праекту ***Франакам Вячоркам.***

- Беларускі Гальфстрым пэўны час быў творчым канкурэнтам літсуполкі Бум-бам-літ. У чым выяўлялася гэта канкурэнцыя?
- Канкуравалі яны даўным-даўно, калі не было яшчэ праекту кіно і не было ніякага альтэрнатыўнага літаратурна-музычнага руху. Тады паўставалі новыя мадэрновыя плыні, з'яўляліся новыя імёны, такія, як Зміцер Вішнёў, Андрэй Хадановіч, Сяргей Патаранскі… І паміж німі ўзнікла непаразуменне.
Мы – гэта новы "Беларускі Гальфстрым", які ўзнік 2 гады таму. Мы займаемся выдавецкай дзейнасцю, музыкай і відэапрадукцыяй.

- Як узнікла ідэя агучваць фільмы па-беларуску?
- Гэта ідэя лётала ў паветры. І ўпершыню была рэалізаваная ініцыятывай "Беларускі відэаклуб" Віталя Станішэўскага.
У той жа час быў створаны праект "Сотвар". Яго ўдзельнікі пераклалі мультфільмы Уолта Дыснея, такія, як "Жыццё жукоў", "Прыгажуня ў сонным лесе", "Аліса ў краіне цудаў" і іншыя на беларускую мову. Потым гэты праект знік, тыя людзі адышлі ад справы, і мне прыйшла ідэя аднавіць ініцыятыву перакладу фільмаў на родную мову. У 2004 годзе мы стартавалі праектам перакладу фільма "Любоў насамрэч".

- Па якім прынцыпе вы падбіраеце фільмы для перакладу?
- Прынцыпа пэўнага няма. Галоўнае, каб фільмы ахоплівалі ўсе пласты насельніцтва, каб людзі мелі магчымасць паглядзець кіно па-беларуску. Прынамсі, наш першы праект "Любоў насамрэч" – папулярны галівудскі фільм, рамантычная камедыя. Працягнулі моладзевым, сцёбным мультфільмам "Шрэк 2"; пасля была "Маленькая калядная казка" - сямейная гісторыя-прыгода - і закончылі спецыялізаваным, на ўсе ўзросты фільмам "Крымінальнае чытво". Пэўнага крытэрыю для адбора фільмаў няма. Галоўнае, каб стужка была адметная, каб яна глядзелася, была цікава моладзі.

- Як вы падбіраеце людзей на агучванне роляў?
- Зноў жа, прынцып асабісты. Першнаперш, гэта акцёрскія здольнасці. Чалавек, які агучвае фільм, павінен прынамсі ўмець працаваць перад мікрафонам, умець граць голасам, інтанацыяй, калі трэба, устаўляць жывыя, натуральныя фразачкі, слоўцы. Каб фільм выглядаў вельмі жыва. Каго, як не беларускіх музыкаў, у гэтай справе хваліць? Музыкі, якія заўсёды размаўляюць па-беларуску, вельмі арганічна ўпісаліся ў наш праект. На агучванне стужкі "Любоў насамрэч" мы запрасілі з дзесятак акцёраў з беларускіх тэатраў… Яны спраўляліся горш, чым некаторыя музыкі, таму што яны граюць на сцэне па-беларуску, але ў жыцці на ёй не размаўляюць. Важна ўмець заўсёды размаўляць па-беларуску і пры агучванні рабіць фільмы жывымі.

- Як вы распаўсюджваеце вашу прадукцыю?
- Распаўсюд розны. Ёсць магчымасць распаўсюджваць на кірмашах, на БелЭкспо, на розных сядзібах, офісах і, безумоўна, праз Інтэрнэт. Ёсць сайт www.knihi.net, які з'яўляецца афіцыйным распаўсюднікам нашых фільмаў. Адміністратары сайта прымаюць замовы з Беларусі, з-за мяжы і па пошце рассылаюць фільмы, DVD-дыскі.

АСЯ [паплаўскаja]

Уладзімер Арлоў – чароўны-чароўны мужчына. Ён мае чароўныя цыганскія вочы, чароўны пярсцёнак і чароўную магічную сілу, якая засталася яму ў спадчыну ад дзвюх бабуляў... Нам думаецца, гэтага больш чым хапае, каб не толькі ствараць шыкоўныя эпатажныя вершы пра каханне, але і да вар'яцтва зачароўваць жанчын. Гэтыя чары падзейнічалі і на нас :) , пакуль мы гутарылі з ім пра каханне, седзячы на мяккай канапе ў яго ўтульнай кватэры...

– Як вашыя справы, спадар Арлоў? Над чым зараз працуеце?

– Ведаеце, у мяне ёсць такая кніжка "Краіна Беларусь", важыць два кілаграмы (ну, я думаю, гэта не галоўная яе вартасць). Гэту кнігу я вельмі люблю. Цяпер працую над яе працягам, не храналагічным, а як бы ўглыб і ўшыркі. Гэта будзе кніга пра Вялікае Княства Літоўскае. Яшчэ на стале карэктура кнігі "Імёны свабоды" і накіды эсэ пра выспу Готланд, на якой я нядаўна быў па запрашэнні Швэдскага ПЭН-цэнтру і Швэдскага інстытуту. Фантастычная мясціна. На ёй сто гатычных храмаў, якія захаваліся да нашых дзён.

– Хутка і ў нашай краіне будзе святкавацца дзень усіх закаханых. Як вы ставіцеся да такога свята? Ці адпавядае яно, на ваш погляд, нашай культуры?

– Я ўвогуле за тое, каб святаў было больш. У нейкім сэнсе Дзень святога Валянціна, вядома, рэкламаваны ў пэўных мэтах. Але я зусім не супраць гэтага свята, якое стала часткай еўрапейскай культуры, культуры хрысціянскай, калі хочаце. У нас можа быць і яшчэ некалькі святаў, прысвечаных каханню: Купалле, Гуканне вясны...

– Беларускія паэты жартуюць, што за ноч кахання можна не толькі зрабіць жанчыну беларускай, але і зрабіць беларуса...

– Як сказаў адзін мой калега, нас уратуе сэксуальны фронт! Вы так эўфемістычна гавораце...(спадар Уладзімір смяецца)

– Вы згодны з гэтым ?

– Так. Каханне ратуе Беларусь дагэтуль!.. Каб не жанчыны, Беларусі б ужо не было. Я нават маю на ўвазе не працяг роду, а ролю нашых жанчын у гісторыі. Уявіце сабе, што было б, каб Рагнеда не ўзяла б у тую ноч, апісаную летапісцамі, у рукі кароткі меч, не ўзняла яго над Уладзімірам. Уладзімір не прачнуўся б, не адвёў удару, не выслаў бы яе з малым Ізяславам на Радзіму, Ізяслаў не вярнуўся б у Полацк, не аднавіў яго незалежнасць ад Кіева – і ў выніку ўсяго гэтага не было б цяпер на палітычнай мапе свету краіны пад назваю Рэспубліка Беларусь...А жанчын: Рагнеду, Эмілію Плятэр, Ларысу Геніюш натхняла каханне, напэўна...

– Якое каханне ў гісторыі вас асабліва ўражвае?

– Мяне у свой час захапіла гісторыя кахання Жыгімонта Аўгуста і Барбары Радзівіл. Вольга Іпатава ў адным з сваіх твораў апісала каханне Еўфрасінні і дойліда Іаана...Таксама верагодна. Мяне цікавяць і гісторыі не зусім ра-

Пятро Васючэнка

ПАДПАЛЬВАНЬНЕ КАХАНКАЎ

Падпальваньне каханкаў на сенавале раўнівым мужам – пашыраны ў сусьветнай літаратуры сюжэт. Я сустрэў яго ў славянафільскай п'есе А.Астроўскага «На бойкім месцы» і ў рамане «Сяляне» Рэйманта.

ЧАЙЛЬД ГАРОЛЬД І БЕЛАРУСЬ

Адсутнасьць чайльдгарольдаўскіх рамантычных вобразаў-тыпаў у беларускай літаратуры тлумачыцца спрадвечнай народнай непрыязьзю да абібокаў і дзіндзівіраў.

Чайльд Гарольд і ягоныя расейскія браты – Анегін, Пячорын, Абломаў – «люди праздные».

У нечым падобны да іх наш дзядзька Завальня, аматар страшных показак. Ён не гультай. Але ягоныя землякі з Расоншчыны сёньня так тлумачаць паходжаньне ягонага прозьвішча: «Ляжаў на печы, **як завала**, толькі казкі слухаў, таму яго й празвалі «Завальня»».

Ільля Мурамец не пралежаў бы на нашай фальклорнай печы і трыццаць тры гадзіны.

Рускі фальклорны тыпаж: Ямеля на печы. Гультай робіцца царскім зяцем, прыгажуном.

Беларускі тыпаж – Хведар Набілкін. Малахольны вясковы Санча ператвараецца ў рыцара.

Ганна Кісліцына

Сэкс — плод фантазіі, сперма — літаратурны атрыбут… Тады каханне — што? Рэфлексія з нагоды любавання ўласным адбіткам ў люстэрку? Оскар Уальд напісаў, што ручай, у які глядзеўся Нарцыс, цешыўся сваім адлюстраваннем у вачах юнаках. Гэта вельмі актуальнае вызначэнне кахання. «З табой — як з сабой!» — так гучыць сёння шчырае прызнанне. Падвоенае адлюстраванне — прынцып постмадэрновай самазакаханай культуры. Прынцып постмадэрновага часу, калі няма сіл на расчытванне-разгадванне Другога. «Каханне — гэта гульня і нічога больш, яно баіцца ўзаемнасці, прывязлівасці, адданасці, баіцца сплочваць пазыкі і любіць загадку і ілжывыя шляхі,»[9] — у гэтым сказе Л.Петрушэўскай слова «каханне» можна замяніць выразам «сучасная літаратура».

Літаратура і каханне яшчэ не атаясаміліся, але ўжо занадта блізка падыйшлі адно да аднаго, разыкуючы ўтварыць паняційнага мутанта.

З артыкула «Што такое каханне ў параўнанні з біфштэксам?»

Драматический театр белорусской армии вновь приглашает к себе в гости на премьеру спектакля «Воробьиная ночь».

Пьесу Алексей Дударев написал по мотивам известного рассказа Владимира Короткевича «Паром на бурной реке». Драматург признался: «Произведения Короткевича очень сценичны, хотя создавать по его рассказам или повестям пьесы весьма непросто. Ведь смысла, боли, да и просто исторической информации у великого писателя больше в подтексте, чем в самом тексте. Короткевича надо суметь почувствовать, понять, раскодировать».

Спектакль «Воробьиная ночь» - это грустная и печальная история о любви, чести, совести, бессмысленности любого кровопролития. Это трагедия человеческой души: во имя чего? или из-за кого? – не известно… множество вопросов задают создатели спектакля и зрители, но ответ у каждого будет свой.

Все чаще столичные театры стараются удивить уже искушенных минчан некими премудростями, кто-то даже называет свои творения «эпатажными». Обнаженная фигура молодой актрисы или актера, эротические мизансцены, нецензурные высказывания – именно таким способом современные режиссеры стараются привлечь зрителя, а последний, в свою очередь, покупается (однако, главное – не продешевить!). Драматический театр белорусской армии – это театр сильных чувств, и удивлять он обещает лишь искусством.

По словам режиссера спектакля Марины Дударевой, коллектив театра взялся за очень непростой материал, что вызывает любопытство как у труппы, так и у зрителей.

Замечательная музыка композитора Владимира Кондрусевича и оригинальная сценография Ольги Мацкевич наиболее точно передают настроение природы и людей, переживающих августовскую бурю или, как ее еще называют в народе, «воробьиную ночь».

Подобно Герману из «Пиковой дамы», сходят с ума капитан Леонович (Игорь Фильченков) и корнет (Святослав Астрамович), все время повторяя: «Тройка, семерка, туз! Тройка, семерка, дама!..».

А ведь и бури могло не быть, и ночи, и слез юной супруги повстанца (роль исполняет Евгения Жукович) и дуэли, если бы… А имеет ли человек право вмешиваться в законы природы? Ответ на этот вопрос предстоит найти вам, дорогие зрители.

Анна САУТКИНА

* * *

Капяжы… Капяжы… Капяжы…
Не кахаеш мяне – не кажы.
Не кажы, што надзеі няма,
Не кажа, што растала зіма.

Я – зіма. Я сваё не аддам.
Мы падзелім цябе напалам:
Будзеш днём сустракацца з вясной,
А уночы ты будзеш са мной.

Выбачай. Як жа быць? Памажы!
Капяжы…Слёзапад… Капяжы…

Настасся НАРЭЙКА

* * *

Ю. К.

І цябе чакаць треба. Пастаянна.
Перманентнае паветра
Вакол мяне задыхаецца.
Лісты восеньскія чыпсамі
рыфленымі пад нагамі крошацца.
Крок твой няўпэўнены
Блытаецца. Хістаецца. Вагаецца.
Ты спакой свой
Малаком п’еш топленым.
Цішыней упіваешся.
Я об гаману вуліц разбіваюся
воплямі.

Воля ЧАЙКА

ГРИПП

Поишь, сдержанно дыша:
Пью – и обливаю грудь –
Из Медведицы Ковша
Кипяченый Млечный Путь

С медом. Им обожжены
Губы, пока пульс стучит
Под горчичником луны,
Меж заточенных ключиц.

Раскраснелась, как искра,
Каракум сковорода.
Приложи к моим вискам
Антарктического льда.

Не вздохнуть и не вдохнуть
В плоскогубцах из равнин.
То ли магма, то ли ртуть
Вместо свернутой крови.

Тает изо льда изба,
И запекся, точно грусть,
На растресканных губах
Кипяченый Млечный Путь.

Наталья ПРОВАЛИНСКАЯ

Уладзімір Арлоў:

“Каханне ратуе Беларусь дагэтуль!..”

мантычныя, ці з не зусім рамантычным фіналам. Напрыклад, каханне Станіслава Аўгуста, які тады яшчэ не быў нашым вялікім князём і каралём, да Кацярыны II, якая не была ў той час імператрыцай. Яны, я думаю, пасапраўднаму кахалі адзін аднаго. Станіслаў Аўгуст пакінуў захоплены слоўны партрэт Кацярыны, які мне падабаецца больш за любы яе жывапісны партрэт. Яны і дня не маглі пражыць адзін без аднаго. Ну, і які працяг мела гэта каханне? Яна стала царыцай, узвяла Панятоўскага на трон, а потым сама і пазбавіла яго гэтага трону, спыніла ў 1795 годзе гістарычны гадзіннік ягонай дзяржавы, а трон загадала прывесці у Пецярбург і, цытую: “приспособить для отправления своих ежедневных физиологических потребностей». Папросту трон ператварыла ва унітаз і атрымлівала ад гэтага задавальненне. На гэтым троне ў 1796 года яе і хапіла кандрашка. Нядоўга яна на ім, так бы мовіць, пакайфавала…

– Вам прыходзілася рабіць калі-небудзь “подзвігі” дзеля свайго кахання?

– Ну, яшчэ ў дзяцінстве я мог не вяртацца дамоў да раніцы. Гэта было маленькім подзвігам. Бацькі дасталіся мне вельмі строгія. Тата быў пракурор, ён мне казаў, што аднойчы ледзь міліцыю на ногі не паставіў, каб мяне адшукалі. Неяк ў студэнцкія гады я, каб прыляцець да каханай, здабыў квіт на самалёт, калі квітоў не было на месяц наперад. Здолеў прыкінуцца лётчыкам і ляцеў у кабіне. Таксама маленькі подзвіг...

– У мінулым годзе Леанід Дранько-Майсюк прапаноўваў нашым чытачам «рэцэпт», як трэба заляцацца да дзяўчат. Які ваш варыянт?

– Я думаю, што жанчыны нашы настолькі непаўторныя, што ўніверсальнага рэцэпту не існуе. Часам я кажу, што мне дапамагае мой пярсцёнак, што ён прыварожвае. Можаце паглядзець… (Здымае пярсцёнак і дае нам, але папярэджвае, усміхаючыся, што пярсцёнак чароўны і мы можам закахацца. Відаць, пярсцёнак пачынае дзейнічаць, бо мы... і не супраць). Ці я ў вас закахаюся (загадкава бліснулі чорныя вочы спадара Арлова – мы тым больш не супраць!)… Магчыма мне дапамагае і сіла, што засталася мне ў спадчыну ад бабулі Аўгінні, якая была добрай чараўніцай. А яе родная сястра бабуля Грыпінка ўвогуле была сапраўднай ведзьмай, якая сядзела ў сталінскія часы сем гадоў за знахарства. У бабы Грыпінкі была кніга “Чорная магія” 1811 года выдання. Там змяшчалася больш за тысячу рэцэптаў на кожны выпадак жыцця. І там былі якраз рэцэпты ўніверсальныя: напрыклад, як прываражыць хлопца да дзяўчыны, альбо адваражыць, калі ўжо (смяецца) … астынуць.

– Адкуль у вас гэты пярсцёнак? Гэта шлюбны?

– Перад вамі чалавек, які не здолеў насіць заручальны пярсцёнак. Пэўна таму, што мая

істота не прымае золата. Ніколі я ніякіх пярсцёнкаў не насіў. Потым раптам (ужо пятнаццаць гадоў таму) мой сябар Мікола Кузміч (той самы, які аднавіў вобраз крыжа Еўфрасінні Полацкай) падараваў мне на дзень народзінаў пярсцёнак. Бачыце, ён няправільнай формы, каваны, і, як сцвярджае Мікола, у ім пяць тысяч ударaў. Унутры – рачная пэрлінка, такая самая як была на крыжы Еўфрасінні, а гэта (паказвае спадар Арлоў на зялёны каменьчык, гіпнатычна круціць пярсцёнак у руках) – каменьчык хрызапраз, мой камень. Калі паглядзець на пярсцёнак збоку і ўверсе дамаляваць крыжык, то атрымаецца завяршэнне храма. Гэты пярсцёнак вельмі энергетычна ёмісты. Ён ужо стаў часткай маёй істоты.

– Як мяняюцца адносіны да кахання з цягам часу? Што для вас каханне зараз?

– Я думаю, што з гадамі, прынамсі ў мяне, павялічылася адказнасць… І, можа быць, гэта сумна прагучыць, але мне цяжка сказаць “кахаю”. Кожны раз, калі я казаў гэтае слова, яно як бы губляла свой залаты запас. Гэта можна назваць асцярожнасцю. Але і жарсць можа быць сапраўдным падарункам лёсу.

* * *

Пакуль мы *зачаравана* гутарылі з Уладзімірам Арловым, да яго заходзіў мастак Генадзь Мацур, які займаецца афармленнем яго кніг. На наша пытанне, ці будзе ён адзначаць свята ўсіх закаханых, ён слушна заўважыў, што гэтае свята заўсёды з ім. Мы жадаем усімусім, каб гэтае свята таксама заўсёды было з вамі. Каб лёс рабіў вам як мага больш такіх падарункаў, як сапраўднае каханне і жарсць.

Гутарылі
Юлія ДУБРА
і Надзея ГУРЛЕНЯ

АБДЫМАЮЧЫ ЦЯБЕ

Абдымаючы цябе,
я думаю
пра ненапісаны раман,
густыя зараснікі чарнавікоў,
таленавітыя ножкі
знаёмай карэктаркі,
якая пазнала сябе
ў адной з гераіняў…

Абдымаючы цябе,
я згадваю
лілеі
на возеры Люхава пад Полацкам,
свае адлюстраванні
ў парыскіх лужынах,
кавярню з адзіным сталом
у каталёнскай вёсцы,
дзе Сальвадор Далі праездам
пазбавіў нявіннасці
юную пастушку…

Абдымаючы цябе,
я смакую
густое каліфарнійскае віно,
палахлівую пэрлінку
твайго ўлоння,
Міжземнае мора
ў Барсэлёне й пад Фамагустаю,
дзе Атэла душыў Дэздэмону…

Абдымаючы цябе,
я заўсёды ўяўляю
іншых жанчын –
тое, як я буду
абдымаць іх,
і ўсё астатняе,
што малюе
мая цыганская
фантазія…

Але – вось дзіва! –
абдымаючы іншых жанчын,
я ніколі
не ўспамінаю
Сальвадора Далі,
ня думаю пра
карэктуры і карэктарак,
не смакую
пяшчотных ракавінак
і не уяўляю
іншых жанчын.

Абдымаючы іншых жанчын,
я думаю толькі пра тое,
каб хутчэй усё скончылася,
каб зноў абняць
цябе.



ЛИДЕРЫ ПРОДАЖ или

Что требовалось от авторов, чтобы в этом месяце оказаться в книжных ТОР'ах

Упомянутые ниже люди своего времени зря не теряли, и… В общем, встречайте, с завистью, пренебрежением, злостью – авторам, в сущности, все равно.
Прошу не обижаться, если некоторые из встреченных ниже фамилий (а возможно, и все) вас оскорбят или возмутят. Их покупают, и самое главное, читают; «пипл хавает», как говорили великие, ничего не поделаешь.
Это – лидеры книжного масскульта (за одним, наверное, исключением), и не всегда от него стоит воротить нос. Спрос создал такое предложение…

Сергей Минаев
«ДУХLESS»

- проникнуться западным «корпоративным духом»;
- написать роман для корпоративных сотрудников о рутинной офисной жизни, приправленный casual sex'ом и кокаиновыми дорожками;
- подогреть интерес читателей скандалами с Gallup Media, EMI и другими музыкальными гигантами.

В магазине скажут:
«Вся правда об офисах, ночных клубах и Prada»

Владимир Сорокин
«ДЕНЬ ОПРИЧНИКА»

- родиться в России;
- заслужить репутацию «писателя-калоеда»;
- скрываться от недовольных моралистов, грозящих расправой;
- выдать неожиданную злободневно-футуристическую историю о возрождении монархии и опричнины, уже не слишком пестрящую извращениями и расчлененкой.

В магазине скажут:
«В «Дне опричника» Сорокин невероятно правдоподобно описал будущее России»…

Дюша Романов
«ИСТОРИЯ «АКВАРИУМА». КНИГА ФЛЕЙТИСТА»



- стать музыкантом;
- играть в «Аквариуме»;
- обидеться на Бориса Гребенщикова;
- дождаться распада «золотого состава» группы;
- написать почти «семейную книгу» коллектива.

В магазине скажут:
В магазине, скорее всего, удивленно вытаращат глаза. Не удивительно, проект-то, в общем, направлен на определенного потребителя, автор в широких кругах неизвестен, да и не с нами он уже, к сожалению. Однако если вам небезразлично творчество «Аквариума» и хочется составить какое-то представление не о примелькавшемся БГ, а об остальных участниках одной из главных рок-формаций СССР (им в силу личных причин Романов уделил много больше строк) – вам сюда. Это не «творческая кухня», никаких «рецептов» и тому подобного здесь нет. Есть живые люди, которые в смутное время играли рок-н-ролл. Книгу найти нелегко, но если очень захотите...

Илья Стогоff
«ЧЕТВЕРТАЯ ВОЛНА»

- сменить более 10 профессий (в том числе учителя и редактора эротического журнала);
- стать «журналистом года» в Петербурге;

- иметь степень магистра богословия.

В магазине скажут:
«Четвертая волна» - книга о «новой альтернативе», первом музыкальном стиле, родившемся уже в нынешнем столетии

Пауло Коэльо
«ЗАИР»

- иметь за плечами ну оЧень бурную молодость;
- стать наркоманом;
- несколько раз попасть за решетку;
- избавиться от наркозависимости;
- став на «путь праведный», потрясти весь мир поп-адаптациями библейских текстов, изредка густо присыпая их откровенной порнографией.

В магазине скажут:
«Вполне вероятно, что вскоре критики назовут «Заир» лучшим из романов знаменитого бразильского писателя»

ПРОДАЖНЫЕ ЛИДЕРЫ?

Оксана Робски
“УСТРИЦЫ ПОД ДОЖДЕМ”

- родиться женщиной;
- досконально изучить жизнь гламурной «рублевки»;
- погрязнуть в скандалах, активно освещаемых «желтой» прессой;
- бросить невзначай в интервью, что «мужчины голубеют со страшной силой».

В магазине скажут:
«Известная сценаристка и журналистка разрушает стереотипы. Оксана Робски представляет на суд читателя удивительно тонкое, живое и трепетное повествование, наполненное глубокой философией повседневности»

Виктор Пелевин
«АМПИР V. ПОВЕСТЬ О НАСТОЯЩЕМ СВЕРХЧЕЛОВЕКЕ»

- получить специальность электромеханика;
- окончить Литинститут;
- отслужить в армии;
- написать «креатиff» по мотивам античных мифов и еще добрый десяток книг – «криков» поколения.

В магазине скажут:
«Пелевин сейчас нужен, как никогда»

Андрей Малахов
«МОИ ЛЮБИМЫЕ БЛОНДИНКИ»

- стать одним из самых скандальных телеведущих;
- написать книгу в жанре «черной комедии»;
- заявить, что «я писателем категорически не являюсь»;
- напечатать весь тираж на переработанной бумаге.

В магазине скажут:
«Где теряет килограммы московская элита? На каком кругу ада уготовано место Маше Малиновской? Жизнь в кадре и за»



Харуки Мураками
«КРАЙ ОБЕТОВАННЫЙ»

- родиться в Японии;
- стать пацифистом и участвовать в антивоенных демонстрациях;
- написать серию историческо-мистических полотен и зарисовок о токийском метро.

В магазине скажут:
«Край обетованный» - пожалуй, самая острая и спорная книга выдающегося японского писателя Харуки Мураками, исследующая природу зла в современном мире»

Борис Акунин
«ФАНТАСТИКА» (ПРОЕКТ «ЖАНРЫ») «ДЕТСКАЯ КНИГА»



- сменить «неформатные» имя-фамилию на более благозвучные;
- редактировать успешный журнал;
- бросить журналистику, в совершенстве выучить японский;
- написать серию романов о сыщике Эрасте Фандорине, жившем в XIX веке, подхлестнуть к ним интерес экранизациями.

В магазине скажут:
«Проект Бориса Акунина «Жанры» - это попытка создания своеобразного «заповедника» жанровой литературы»…
«Это большой роман о приключениях московского шестиклассника по прозвищу Ластик, правнука великого сыщика Эраста Фандорина»

Подготовил Антон АНАНИЧ

Адам ГЛОБУС

ПАРТРЭТЫ

Намалюю твой партрэт
тушшу на шпалеры,
весялейшы стане свет
у пустой кватэры.

У кахання ёсць сакрэт —
упрыгожваць побыт.
Напішу аўтапартрэт
і пастаўлю побач.

Ніна МАЦЯШ

ЛАСТАЎКА

Заручаная даўніною
З тутэйшым кутам, як і мы,
Шчыруе ластаўка вясною,
Адпрэчваючы ўціск зімы.

Шчыруе ластаўка ўсё лета,
Ці градабой, ці сухавей,
Дзеля гняздзечка, дзеля дзетак,
Як мы дзеля сваіх дзяцей.

Каб перад золлю непазбежнай,
Перад глухой навалай хмар
Загартаваліся належна
Моц крылаў, дух, любові дар.

І птушачцы малой вядома,
Што нам свядома трэба знаць:
Любоўю толькі можна стому,
Жыццё і скон свой апраўдаць.

Лучом няздрадліва святлістым
З абжытай родам стараной,
Дзе восень спелым, вольным лістам
Кружляе ўжо і нада мной.

Ах, ластавачка!..

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ

«Адна» – значыць «бедная»? Недастатковая, няспраўджаная. Чароўная архідэя, непрысмактаная да дрэўца-кармільца, зялёная гірлянда плюшчу, абарваная з апірышча, – бяссілы прыгожы паразіт, які толькі і марыць ласкава аплесці новага гаспадара... Так, Стась імкнуўся быць гаспадаром. І калі яму, таленавітаму праграмісту, удалося выйграць грант на стажыроўку ў Штатах, абвесціў адразу: назад – не вернецца, легалам ці нелегалам – застанецца там. І Паліна хоць бэбі-сітэрам, але прыладкуецца. Вядома, наўрад ці – гісторыкам.

Не, гэта не быў выбар між прафесійнай апантанасцю і сямейнасцю. Хутчэй – уцёкі ад лёсу плюшчу.

Урывак з паралельнага раману «Золата забытых магіл»

Ніна МАЦЯШ

ЖАРТ

У шчасця майго
Тваё аблічча,
Твой голас,
Твае вочы і ўсмешка.
Нават дзверы не стамляліся
Чакаць твайго стуку.
І ён раздаўся нарэшце:
«Гэта я, тваё шчасце. Адчыні!»
Але што гэта?..
Не тое аблічча,
І голас не той,
І не тыя вочы і ўсмешка.
Не паспела я
Абурыцца такім самазванствам,
Як пачула:
«Ах, якая ты смешная!
Жарту зноў не пазнала?
Гэта ж я,
Твая адзінота!»

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

* * *

Мы не бачыліся цэлае каханне,
На маёй трывозе – сівізна.
Там, дзе ўспомню пра тваё дыханне,
Там і пачынаецца вясна.

Старасці жаданай вобраз блізкі,
Нібы хваля светлая, мяне
Вынесе на бераг лігурыйскі
І пенсійнай пенай ахіне.

Лепшага не прычакаю шчасця!
Адчуваючы пахіл круты,
Я хачу да старасці прыпасці
Кожны раз, калі далёка ты.

За маўчаннем, горкімі садамі,
Што аслеплі ў сонечным пяску,
Ахвяруеш, вечна маладая,
Дні – дранько, а ночы – майсюку.

Віктар ЖЫБУЛЬ

ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ

У першую гадавіну
вызваленьня Сатурна
ад марсіянскае акупацыі
сатурніяне далі адзін залп салюту,
у другую гадавіну – два,
у трэцюю – тры,
у дзесятую – дзесяць
з інтэрвалам у адну хвіліну.
На чатырохсотыя ўгодкі
сатурніянскія гарматы
салютавалі ўжо амаль усю ноч,
але за столькі гадоў сьвяткаваньняў
сатурніяне ўжо прызвычаіліся
спаць пад гарматныя стрэлы.

...Вось ужо 1440 гадоў
сатурніяне з марсіянамі
жывуць у міры й згодзе,
і кожную хвіліну – салют,
і кожную хвіліну – сьвята.

Анатоль ІВАШЧАНКА

* * *

ты загадала высечы дрэвы
пад нашымі вокнамі
й мы назіралі першы захад

ты загадала
адсячы прыхільнасьці
й мы забыліся на мову

ты загадала зьняць
чорныя акуляры
й мы забыліся на люстэркі

ты прапанавала выйсьці на вуліцу
й сонца рабіла нам фотасэсію
ў лужынах вітрынах і шыбінах аўто

аднойчы ты адмяніла грошы
і мы зьведалі
каханьне

Джэці

ЗЛАЧЫННЫЯ КАХАНКІ

Мы кахаліся,
а ў небе счарнелым
пруцянелі хмары,
і птушкі здраньцьвелыя
абсыпаліся на зямлю
зь сінімі вуснамі;
мы ня біліся,
мы абдымаліся,
а навокал усё распадалася
на зыходныя складнікі,
і ўсе пацыфісты навокал
раўлі і злаваліся;
мы не змагаліся -
мы цалаваліся,
а суседзі грукалі ў сьцены
шарамі чыгуннымі чорнымі
і крышылі на нас
збудаваньні Хрушчова і Брэжнева,
МЫ АДНО ЦАЛАВАЛІСЯ,
але ўсім здавалася,
што мы робім нешта горшае –
недазволенае і грэшнае;
МЫ АДНО АБДЫМАЛІСЯ,
але ўсе так абураліся,
быццам мы плявалі
на мілыя ім магілы;
МЫ АДНО КАХАЛІСЯ,
але нас прысудзілі да расстрэлу,
Напэўна, за тое,
што нас.было трое.

Зміцер ВІШНЁЎ

* * *

Зашыфраванасць тваіх белых каленяў
У сэйф я зьбіраю лакавыя валаскі
Нахіляецца ліхтар камісара
На вуснах застыглі кроплі расы
Мая рука як ліса
На пальцах брыль сонца
У вачах залатыя блісы
Ты выгінаешся пантэрай
Ты выгінаешся гюрзой
Ты выгінаешся шынай б'юіка
Гэта – тэрор
Мякаць твайго цела зьмяняецца
Па меры зьмены мясцовасьці
Гэта – тэрор
Я хачу здохнуць альпіністам
Маленькім самцом-павуком
Як прыемна шоргаюць сьцяблінкі травы
Я ем гэтае поле
У вочы ляціць пух таполі



Арт-журналистика

ЧАСТЬ ПЕРВАЯ. ТЕОРИЯ.
«Какая гадость эта ваша…»

Современные журналисты, пишущие об искусстве, слишком много внимания уделяют описанию самих произведений и собственных impressions от посещения различных выставок вместо того, чтобы детально анализировать работы, обобщать, типизировать и соотносить эти работы с «социокультурным контекстом» - таков упрек Господ Серьёзных Критиков. Искусствоведческая критика превращается в арт-журналистику – и это плохо, считают Господа.

А по моему скромному мнению (обычно люди, которые употребляют этот оборот, свое мнение скромным не считают, но я не из их числа), нет занятия более неблагодарного, чем попытка «типизировать» и «обобщить» творчество Художника (да, это текст с пафосными словами, начинающимися с больших букв!). Внимательный зритель все равно обойдет любые искусствоведческие препоны и художественный шоры, которые так тщательно малевал критик, и в произведении искусства увидит ровно то и ровно столько, сколько он хочет и в состоянии увидеть. И плевать он хотел на любые «основные черты» и «типические особенности», а также прочие терминологические изыски, сочиняемые высоколобыми «профессиональными любителями искусства». Творчество настоящего художника направлено на разрушение рамок и канонов. Но всегда найдется критик-искусствовед, который захочет милого свободного художника уложить в прокрустово ложе «основных особенностей» и «типических черт». Так что в этом смысле арт-журналистика гораздо демократичнее и свободнее искусствоведческой критики, а значит – ближе к искусству. В каком случае зритель захочет ознакомиться с выставкой: если пред ним положить сухой академический «разбор» или живое, яркое повествование (снабженное иллюстрациями, желательно)? То, что сочно описано, хочется увидеть побыстрее собственными глазами. Долой занудный академизм!

Разумеется, вся вышеизложенная инвектива в адрес серьезной академической художественной критики была написана с целью оправдать собственный способ журналистского письма, так как в том, что я пытаюсь заниматься арт-журналистикой, у меня нет ни малейших сомнений.

Другое дело, достаточно ли среди пишущей арт-журналистской братии людей, которые в состоянии талантливо описать все свои *«импресьёнс»*. Достаточно ли среди нас, арт-журналистов, людей, с действительно хорошим вкусом и к живописи, и к слову? Достаточно ли среди нас действительно образованных людей, причем не только интеллектуалов, но и интеллигентов? (Способ постановки вопросов и настойчивость повторения слова «достаточно» должны довести до мысли читателя этого текста, что - *недостаточно*).

Еще одно слабое место всего этого пламенного «многабукаф» в том, что сама я даже настоящим арт-журналистом не являюсь – на факультете слишком поздно начинают готовит профессионалов в области арт-критики, а заниматься изучением тенденций, направлений и т.п. самостоятельно… Помилуйте, но это невозможно. ~~Мы ведь такие ленивые~~. Надо, чтобы деток еще с первого курса регулярно водили за ручку на выставки, тыкали пальчиком в картину и объясняли им: «Это виноград, а это лиса, ~~этим произведением художник хотел сказать что-то очень важное, но у него не получилось~~ это пример абстракционизма в искусстве, а вот здесь вы видите архетип». J Я нарочно утрирую, но такие экскурсии необходимы, чтобы достойно подготовить специалистов в области хотя бы злосчастной арт-журналистики, не говоря уже о «серьезной» искусствоведческой критике.

во всей своей красе

* * *

To be honestly до конца, Господа *Сурьёзные* Критики правы: не хватает у нас профи, которые анализировали бы произведение искусства, «соотнося его с социокультурным контекстом».

… А молодой арт-журналист напоминает щенка, которого в первый раз вывели на прогулку в поле – много резких вкусных запахов, трава режет нос, копошатся козявки – и все-все-все надо обнюхать, попробовать на зуб, нарыть кучу ямок, побегать за палочкой, которую бросает неуемный хозяин. Да, еще обязательно надо справить естественные надобности – а то хозяин отругает. Столько дел – и он мчится по полю, виляет глупым хвостом, подгибаются его мягкие лапы… Oh, impressions!..

ЧАСТЬ ВТОРАЯ. ПРАКТИКА. «Прэлестно, просто прэлестно!..»

Алесь Мара - воздушный псевдоним для художника. Юноша бледный со взором горящим и кисточкой в руках? Нет, пожилой человек. Но с фантазией ребенка и эротическим пылом подростка.

Из аннотации: «Графика… Живопись… Аллегорически-образные произведения… 39 работ». Сотрудница Галереи (странная и немного заторможенная девушка) протягивает мне прайс-лист. От 700 тысяч до 3 миллионов. Н-ну…

Зал Галереи небольшой, картины мешают друг другу, толкаются и теснятся. Написанные в разной художественной манере – от прозрачной графики до жирными мазками «вылепленной» живописи – работы «пищат», «толкаются» и «разрывают» взгляд зрителя своим разнообразием. Весенние пейзажи с классическим тающим снегом и мокрыми березами, осенние натюрморты (желтые, красные яблоки, «бел-чырвона-белы» рушник, плетеная корзинка a-la Ситница, кленовые листья – будь благословенна, белорусская осень!), абстракции на музыкальную и зимнюю темы… Непосвященный никогда бы не угадал, что все это прекрасное многоголосие – творение одного художника.

Влияние японской живописной традиции? Просматривается безусловно. Вертикальные, довольно узкие полотна, светлые цвета – и это не привычная розово-голубая, зефирная пастель, а сдержанные оттенки оливкового, благородного серого, серо-зеленого, сливочного тонов.

«Камыш»: даже в названии – ветер и легкие сквознячки. Не нарисованный Хакусаем Кацуиску , но созданный Марой один из видов Фудзи. Только горы не видно - она спряталась за туманом, а среди тонко прорисованных стеблей камыша плещется отражение луны (заметьте – отражение всегда плещется, но это красивый литературный штамп для штампа живописного). Серая луна с блекло-золотистым отливом – новый взгляд на затасканную художниками планету. Благородная, аскетичная живопись. Очень холодная. Чистая.

«Прелюдия осени»: в воздухе парит то ли коричневая бабочка, то ли засохший кленовый лист – на самом деле это растение с пышным когда-то цветком, из которого осень выпила все соки. (Хорошее бы получилось хокку!)

Женские портреты, женские профили… Музы, богини, ангелы…

Интересная трактовка образа Евы: резкий профиль, монолизовская улыбка, как будто выкрашенные голубыми тенями глаза – ничего удивительного для современной женщины, но ведь это сама Праматерь. А такой макияж был бы уместен на Лилит. Голая грудь с гротескно большими и острыми сосками, похожими на наконечники копий. На заднем плане мило таращится корова. Вымени не видно – она отдала его Еве. Прародительница держит некую посудину (блюдо?) с яблоками – хватит на совращение нескольких десятков Адамов. Наверное, поэтому она так хитро улыбается.

«Купальский веночек». Перед вами, дорогие зрители, главная героиня языческого праздника – красивая и сексуальная хищница. Полные жадные губы капризно надуты (считается, что у женщины-вамп акцент во внешности всегда идет на губы – ярко-красные, зовущие). Не скромная белорусская д з я ў ч ы н а, а греческая вакханка. Очень свежая, очень земная, с красивой грудью (любимый анатомический акцент художника?). А над головой парит венок из полевых цветов. Мечта любого фавна.

Еще один языческий *звоночек* - «Белая мальва». Жирное, мясистое, наглое растение (по форме оно напоминает фаллос) с крупными грязно-белыми цветами изображено на фоне бушующей первобытной зелени. Это не огород в 6 соток – это джунгли! Они зовут вас, пробуждают настойчивым зеленым шумом-шепотом основные инстинкты, и над этим зеленым морем победно возвышается королева Мальва.

«Вясельная брама»: обнаженная девушка и небольшое стадо гусей. Соблазнение Леды. Хотя это как будто напоминает групповое изнасилование (фу, черный юмор низкой пробы).

«Ева», «Вясельная брама», «Корсиканская мадонна» - *выполнены в классическом (*вот здесь я сомневаюсь – возможно, путаю Марочкина с другим известным графиком, эх!*)*, «книжно-графическом» стиле Марочкина – густые, темные краски, насыщенный колорит, мифологизированность персонажей. Они будто сошли со страниц старых книг – пожелтевший фон, острые черты лица, медовая, тягучая атмосфера самой картины.

Над скучными белорусскими полями, которым художник подарил нежнейший сиреневый цвет, парит «Зимний ангел». Его даже не сразу рассмотришь на полотне. Он сам – как луч зимнего солнца, жемчужного, но холодного. Прозрачный, легкий, он застыл над застывшей от холода, присыпанной снегом землей. И льется музыка - из картины. Невероятное ощущение, но это так. Неслучайно рядом висит «Мелодия зимы» - геометрические узоры, архетипические глаз, вписанный в треугольник, солярный кружок. Кружево снежинок, из которых соткана метель, сводится к этой азбуке древнейших подсознательных символов.

* * *

В ~~скриптории~~ комнате холодно, пальцы скрючились и не хотят стучать по клавиатуре.

Главное – не стреляйте в арт-журналиста. Он ведь еще только учится.

Лена СОСНОВСКАЯ

“ТЭКСТЫ” – 3. ВІШНЁЎ РЭКАМЕНДУЕ

Зміцер Вішнёў прэзентаваў новыя “Тэксты”. Вечарына праходзіла на сцэне Дому літаратараў 26 студзеня.

“Тэксты” – хто не ведае – гэта такі ці то часопіс, ці то альманах (сам галоўны рэдактар Вішнёў дакладна не высветліў), а хутчэй за ўсё “праект”, заснаваны суполкай “SCHMERZWERK”. Першы нумар гэтага “праекту” выйшаў два гады таму ў выглядзе невялікай чорнай кніжачкі з крыху жудаснай выявай рукі нейкага шкілету на вокладцы. Другога нумару ніхто не бачыў, бо яго і не было. Выйшаў адразу трэці. Па словах спадара Вішнёва, гэта ў іх (рэдакці, так разумею) такая “іншая сістэма ліку”. Потым будуць выходзіць шосты, дванаццаты, соты нумары, а потым ужо і другі ўрэшце выдадуць. Яшчэ спадар Вішнёў заверыў усіх, што рэдакцыя арыентавалася толькі на “цікавыя тэксты (крытыку, аналітыку, эсэістыку, прозу, меней – паэзію, бо выданняў паэтычных у нас хапае)” і раз-пораз паміж выступленнямі аўтараў сур’ёзна паўтараў, што ў “Тэксты” ўвайшлі “вельмі сур’ёзныя тэксты вельмі сур’ёзных аўтараў”. “Сур’ёзны” аўтар Юрась Барысевіч заявіў адразу, што “Тэксты” – “гэта лепшы часопіс, што вы можаце купіць сёння, а можа і за ўсё жыццё”. Такая самарэклама выглядае абсалютна натуральна на фоне яго новых ідэй “напісання і публікацыі твораў”для папулярызыцыі нашай роднай літаратуры. Вось два мае самыя любімыя: “выпусціць на вуліцы ў якасці дэкляматараў гаваркіх птушак – папугаяў ці гракаў. Безумоўна, адна птушка не ў стане вывучыць на памяць аповесць альбо паэму. Дык трэба падрыхтаваць цэлую зграю: кожнага папугая дастаткова навучыць аднаму сказу” ці “абшыць рукапісамі пінжак, штаны і капялюш і ў такім выглядзе шпацыраваць па вуліцах, ці знерухомець, нібы газэтная вітрына, на некалькі гадзінаў у шматлюдным месцы…” (смяялася да слёз).

Валянцін Акудовіч “філосаф-злачынца, якога няма, але ён мае алібі” зачытаў фрагменты з свайго эсэ “Алібі” пра “паэзію без паэта” (не блытаць са “смерцю аўтара”). “Так , час паэтаў прамінуў, але прывід паэзіі ўсё яшчэ блукае па абшарах нашага краю,” – прагучала не вельмі аптымістычна. Але пасля гэтага выходзілі паэты і чыталі свае вершы.. Уладзімір Лянкевіч як заўжды папярэдзіў, што зараз ён прачытае вершык. Адам Глёбус, у чаканні радасці ад выдадзеных “Тэкстаў”, якая прыйдзе бліжэй да ночы ўжо ў ложку, і элегантным чырвоным швэдары, па дамове з Вішнёвым прачытаў два вершы. Зміцер Плян з вельмі…”незвычайнай” манерай чытання (шчыра кажучы, калі ён выкрыкваў сваё “rider on the storm”, я першыя разы тры падпрыгвала ў крэсле, але ўражвае)… Маргарыта Аляшкевіч з какетлівым “Ну што, пачытаць вам вершык?”… Пэрфоманс-суполка “Яна-трыён” з-за недахопу часу пэрфомансы свае не паказала, але яе ўдзельнікі Адам Шостак і Юрась Ленскі агучылі свае вершыкі, якія увайшлі і якія не ўвайшлі ў “Тэксты”. Выступалі яшчэ празаік Альгерд Бахарэвіч і крытык Ірына Шаўлякова. І ўрэшце, Віктар Жыбуль прапанаваў свае творчыя варыяціі на тэму “Што б пісалі беларускія класікі, калі б жылі ў нашай літаратурнай сітуацыі” (“паэзіі без паэта”) і скончыў свой выступ усім вядомым “Наша жыццё – гэта порна”.

На прыканцы вечарыны ўсіх “гледачоў-слухачоў” чакаў (так званы) пэрфоманс “Тэатра псіхічнай неўраўнаважанасці” Іллі Сіна. У цэнтры хола (?) перад залай валяліся пустыя бутэлькі, косткі нейкай, відаць, вялікай жывёліны і іншае смецце, “псіхічна-неўраўнаважана” рухаліся сярод гледачоў тры “фігуры”, дзве з якіх потым закідалі трэцюю рознымі рэчамі і засыпалі нечым белым, падобным на сухое малако. Усіх нюансаў гэтага пэрфомансу словамі не перадасі… (я ж вельмі спачувала прыбіральшчыцы.)

Але “Тэксты” раю набыць. Усё ж такі “сур’ёзныя” аўтары, “сур’ёзныя” тэксты. Вішнёў вельмі рэкамендаваў. Цікава. Месцамі нават весела.

Юлія ДУБРА

Пишите нам по адресу: ***pero_jour@mail.ru,***

а также читайте нас на **www.zhurfak.edu.by**

Наш адрес: 220007, Беларусь, Минск, ул. Московская, 15.

Тел. 660-24-30 (Рита)
755-69-07 (Юля)

Газета напечатана в учебно-издательской лаборатории УЦКТ факультета журналистики

Редакторы **Маргарита АЛЕШКЕВИЧ**, **Юлия ПОПОВА**, **Ирина БОЖКО**
Компьютерная верстка **Валентина КЛЕНИЦКАЯ**
Корректор **Елена СОСНОВСКАЯ**
Ответственные за выпуск **В. А. Капцев, Н. В. Кузьмич**

Тираж 70 экз.